# МОЙ РОДНЫ КУТ, ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ

Паважаныя бацькі! Гэта невялічкі зварот да ВАС – самых першых, хто можа найлепш прывіць сваймy дзіцяці любоў да роднай мовы, да сваёй краіны. Прыслухайцеся да гэтых парад.



**Часцей бывайце разам у вёсцы, у лесе, у полі, ля рэчак і азёр.**

**Вучыце любіць і зберагаць і кветку, і дрэва, і сцяблінку, і птушку, і звера, бо гэта НАША прырода, яна была, калі жылі нашы дзяды– прадзеды і павінна застацца непакалечанай і пасля нас.**



# МЫ – БЕЛАРУСЫ



**У размовах з дзецьмі часцей гаварыце пра Беларусь, яе прыроду, прыродныя багацці, гарады, яе гісторыю, людзей, якімі трэба ганарыцца. Дзіця з малых год**



**павінна ведаць, што яно жыве ў Беларусі, таму называецца <u>БЕЛАРУСАМ.</u>**

# МОЙ РОД. АДКУЛЬ ЁН?

Няхай у пакоі, дзе спіць ці гуляе Ваша дзіця, на сцяне вісіць што-небудзь з беларускім арнаментам – вышыты ручнік, выцінанка, вышыўка альбо іншае.

У ім голас продкаў, ушанаванне спакою і здароўя ў Вашай сям’і.





# РОДНАЯ МОВА – МАТЧЫНА МОВА

**Размаўляйце з дзецьмі па-беларуску. Нават калі адзін з бацькоў не валодае беларускай мовай, праблема можа вырашыцца: дзіця з пялёнак вывучыць дзве мовы: татаву і маміну. Чым больш моваў ведае чалавек, тым багацейшы яго духоўны свет і тым лягчэй яму ўладкавацца ў жыцці. Выпішыце свайму дзіцяці беларускі часопіс, купляйце беларускія кнігі. Арганізуйце дома сямейнае чытанне цікавых урыўкаў з кнігі і абмен думкамі.**



**Не лянуйцеся гэта рабіць, паважаныя бацькі, бо гэта «акупіцца» адданасцю, адкрытасцю і любоўю Вашага дзіцяці.**

# АЙ, ЛЮЛІ, ЛЮЛЯШУ
# Я ДЗІЦЯТКА КАЛЫШУ

**Закалыхваючы дзіця, спявайце яму беларускія калыханкі, якія Вы чулі ад сваіх бабуль, альбо проста любыя меладычныя беларускія песні, хоць і пра каханне. Гэта адкладваецца на ўсё жыццё, а пазней не будзе праблем і з мовай.**



**Уключайце па тэлевізару беларускія калыханкі.**

# ПЕСНЯ І КАЗКА
# ХОДЗЯЦЬ У ПАРЫ

**Расказвайце ці чытайце дзецям беларускія казкі, альбо казкі ішых народаў у перакладзе на беларускую мову.**

***З найлепшымі пажаданнямі В.Н.Кур'ян***